# «Іскрыся іскрамі, палай!»

***Сёлета часопіс «Полымя» святкуе стогадовы юбілей. Каля вытокаў найстарэйшага літаратурна-мастацкага і грамадска-палітычнага выдання Беларусі стаялі такія знакавыя фігуры нацыянальнай гісторыі, як Янка Купала, Якуб Колас, Змітрок Бядуля, Цішка Гартны, Міхась Зарэцкі і інш. У розны час часопіс узначальвалі славутыя пісьменнікі – Платон Галавач, Міхась Лынькоў, Іван Мележ, Пятрусь Броўка і інш. На працягу амаль дваццаці гадоў (1948 – 1967) яго галоўным рэдактарам быў Максім Танк, чый талент, эрудыцыя і дасведчанасць у сусветным літаратурным працэсе спрыялі ўзбагачэнню змястоўна-жанравай палітры выдання.***







На кніжнай выставе «Іскрыся іскрамі, палай!», што адкрылася ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, прымеркаванай да 100-годдзя з часу заснавання часопіса «Полымя», экспануюцца выбітныя творы беларускай літаратуры, якія друкаваліся на яго старонках. Сярод іх – раманы «Людзі на балоце» Івана Мележа, «Птушкі і гнёзды» Янкі Брыля, «Сэрца на далоні» Івана Шамякіна, аповесць «Сотнікаў» Васіля Быкава, проза Івана Пташнікава і Барыса Сачанкі, п'есы Андрэя Макаёнка, вершы выдатных беларускіх паэтаў.

Выстава адлюстроўвае змест і настрой часопіса з самага першага нумара 1922 года да сёлетніх, за 2022 год. Экспазіцыя пабудавана ў храналагічным парадку па дзесяцігоддзях. Побач з часопісам знаходзяцца выданні твораў знакамітых аўтараў, якія ўпершыню былі апублікаваны ў часопісе «Полымя». Прадстаўлены таксама асобнік часопіса «Полымя рэвалюцыі». Пад такой назвай ён выходзіў у 1932 – 1941 гадах.

Сярод рарытэтаў выставы – адзіная прыжыццёвая кніга беларускага паэта Аркадзя Моркаўкі «Дым жыцця» (1928); выданні з дароўнымі надпісамі аўтараў, а менавіта зборнікі вершаў паэтаў – Язэпа Пушчы «Vita» (1926), Андрэя Александровіча «Цені на сонцы» (1930), Максіма Танка «Дарога, закалыханая жытам» (1976); зборнікі прозы пісьменнікаў – Тараса Хадкевіча «Даль палявая» (1959), Паўла Кавалёва «Падзенне Хвядоса Струка» (1967). А таксама выданне першага драматычнага твора Кандрата Крапівы «Канец дружбы» (1934).

Вылучаюцца вокладкі «Полымя», дызайн якіх мяняўся неаднойчы на працягу стагоддзя. Сярод прадстаўленых дакументаў – рарытэтны асобнік з арыгінальнай вокладкай, які выйшаў пад нумарам адзін у 1922 годзе, афармлены выбітным беларускім жывапісцам, графікам і ілюстратарам Міхасём Філіповічам. Звяртае на сябе ўвагу дванаццаты нумар «Полымя рэвалюцыі» за 1940 год з фотапартрэтам народнага паэта Беларусі Янкі Купалы, з нагоды 35-годдзя яго літаратурнай дзейнасці. Адметны дызайн сучасных вокладак «Полымя» распрацаваны Міраславам Шайбаком у 2014 годзе. Візуальны праект быў прысвечаны выбітным дзеячам беларускай літаратуры.

Выстава працуе па 31 снежня ў кальцавой галерэі 3-га паверха бібліятэкі.

*Паводле інфармацыі арганізатараў*